5 (214)
май
2017 год
Выдаецца са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

**Рэдакцыйная калегія:**

**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

**Рэдакцыйная рада:**

**Уладзімір Адамушка, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Грушa, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Чаркоў.**

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба.**

**ЗМЕСТ**

Слова ад рэдакцыі 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Мікола Волкаў, Кірыл Карлюк — Ваенная рэвалюцыя і Паўночныя войны сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст. 5

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Гужалоўскі — Фарміраванне структур грамадзянскай супольнасці ў Беларусі ў 1917 г. 12

ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

Ігар Гушчынскі — Палітыка расійскага ўрада па фарміраванні кадравага складу судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці XIX — пачатку XX ст. 21



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**Ігар ГУШЧЫНСКІ**

# Палітыка расійскага ўрада па фарміраванні кадравага складу судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст.

*Галоўнай мэтай дзяржаўнай палітыкі Расійскай Імперыі ў адносінах да зямель, далучаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, была іх хутчэйшая палітычная, сацыяльна-эканамічная і этнакультурная ўніфікацыя з унутранымі губернямі. Вырашэнне дадзенай задачы набывала асаблівую актуальнасць пасля паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. Пры правядзенні адпаведнай палітыкі расійскі ўрад адводзіў важную ролю судовай сістэме краю.*

Пасля паўстання 1830—1831 гг. судовая сістэма ў беларускіх губернях была ўніфікаваная з унутрырасійскай (да гэтага ў ёй працягвалі дзейнічаць нормы Статута ВКЛ 1588 г. і пастаноў Сойма Рэчы Паспалітай). Паўстанне 1863—1864 гг. спрацавала новую моцную хвалю палітыкі дэпаланізацыі і русіфікацыі ў так званым Заходнім краі (9 заходніх губернях: Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай). Адным з наступстваў гэтай палітыкі стала правядзенне тут судовай рэформы 1864 г., што мела выразны ліберальна-дэмакратычны характар са значным спазненнем — толькі ў 1872—1883 гг. Нагадаем, што гэтая рэформа абвяшчала такія прынцыпы правасуддзя, як самастойнасць судовай улады ад адміністрацыйнай, спаборнасць, галоснасць, усесаслоўнасць; уводзіла суд прысяжных, адвакатуру, выбарнасць міравых суддзяў. Аднак значная частка насельніцтва заходніх губерняў (перш за ўсё дваране рымска-каталіцкага веравызнання і яўрэі) уяўлялася ўладам палітычна нядобранадзейнай. У сувязі з гэтым урад першапачаткова палічыў правядзенне рэформы тут немэтазгодным.

Галоўнай асаблівасцю кадравай палітыкі расійскіх улад у сферы судовай сістэмы стала імкненне фарміраваць асабовы склад судовых устаноў з асоб "рускага паходжання" і не дапускаць на гэтыя пасады асоб "польскага паходжання" (фактычна мясцовых дваран-каталікоў). Лічылася, што яны могуць выкарыстаць судовыя ўстановы для антыўрадавай дзейнасці. Гродзенскі губернскі пракурор П.І.Мілавецкі ў сярэдзіне 1860-х гг. наконт асоб "польскага паходжання" выказваўся так: *"Занимая должности мировых судей и имея, таким образом, прямое соотношение с народом, эти лица будут одними из усерднейших деятелей польской пропаганды. Отправление суда для таких мировых судей будет лишь одною внешнею оболочкою для прикрытия своих намере-*



***ГУШЧЫНСКІ Ігар Генадзьевіч.***

*Намеснік дэкана па вучэбнай рабоце факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1984 г. на ст. Навасады Барысаўскага р-на Мінскай вобл. У 2006 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ па спецыяльнасці "гісторыя, сацыяльна-палітычныя дысцыпліны". У 2011 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю "Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864—1914 гг.)" (навуковы кіраўнік – прафесар А.П.Жытко). З 2010 г. выкладае ў БДПУ. Даследуе гісторыю судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Аўтар больш за 30 навуковых публікацый.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*ний для водворения в крае польского духа и искоренения всего того, что только отзывается русским*"[1]. Што датычыць яўрэяў, то расійскае заканадаўства і так практычна закрывала ім магчымасць займаць пасады ў судовых установах (не лічачы адвакатуры), прычым не толькі ў мяжы аселасці, але і на ўсёй тэрыторыі Расійскай Імперыі[2].

У дадзеным артыкуле разглядаецца палітыка расійскіх уладаў па фарміраванні кадравага складу судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі пасля распаўсюджання тут судовай рэформы 1864 г., якое было паэтапна праведзена ў 1872—1883 гг. Адзначым, што судовыя статуты ад 20 лістапада 1864 г.[3], на якіх грунтавалася судовая рэформа, не прадугледжвалі ў якасці крытэрыяў для кандыдатаў на пасады ў судовых установах новага ўзору этнічную ці канфесійную прыналежнасць. Аднак і пасля іх увядзення ў заходніх губернях захоўвалася тэндэнцыя, што мела мэсца ў папярэдні перыяд — абмежаванне доступу прадстаўнікоў мясцовага дваранства рымска-каталіцкага веравызнання да службы ў дзяржаўных установах краю, у тым ліку ў судах. Варта згадаць меры, прынятыя расійскімі ўладамі пасля паўстання 1863—1864 гг. з мэтай не дапускаць мясцовых дваран-каталікоў да пасад у дзяржаўных органах, у тым ліку ў судах, і адначасова — прыцягнуць на іх асоб "рускага паходжання" (альбо з асяроддзя мясцовых праваслаўных землеўласнікаў, альбо з унутрырасійскіх губерняў). Законы ад 4 лістапада 1863 г.[4] і 24 жніўня 1864 г. прадугледжвалі значныя дадатковыя грашовыя дапамогі і надбаўкі ў Заходнім краі для асоб "рускага паходжання" з ліку служачых ведамства міністэрства юстыцыі. У дадзеным кантэксце варта таксама згадаць інструкцыю "О порядке продажи казенных земель в западных губерниях лицам русского происхождения, служащим в том крае или желающим водвориться там на постоянное жительство" ад 23 ліпеня 1865 г.[6], якая мела на мэце прыцягненне сюды на дзяржаўную службу асоб "рускага паходжання" з уласнарасійскіх губерняў. У той жа час прымаліся захады па закрыцці доступу да яе асобам "польскага паходжання". 27 мая 1864 г. расійскім імператарам Аляксандрам II была зацверджаная пастанова Заходняга камітэта аб замяшчэнні ў краі ўсіх службовых пасад, якія мелі непасрэдныя зносіны з народам, выключна асобамі "рускага паходжання"[7]. "Высочайшие повеления" (г. зн. распараджэнні імператара, не афармленыя заканадаўча, у тым ліку вусныя) ад 27 чэрвеня, 2 лістапада 1869 г. і 25 снежня 1870 г. забаранялі прызначэнне асоб "польскага паходжання" ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях на любыя пасады[8] (хаця на практыцы гэтыя пастановы выконваліся не заўсёды).

Заўважым, што раней адзначаная тэматыка толькі часткова была закранута ў шэрагу даследаванняў у кантэксце вывучэння рэалізацыі судовай рэформы 1864 г. на тэрыторыі Беларусі і палітыкі самадзяржаўя ў краі ў цэлым. Так, прадстаўнікі савецкай гістарыяграфіі А.У.Марыскін, Ф.Р.Бялевіч, С.М.Самбук выдзялялі два асноўныя чыннікі фарміравання тут кадравага складу судовых органаў — нацыянальны і класавы. Гэта, на іх думку, знаходзіла адлюстраванне ў імкненні расійскага ўрада не дапусціць на адпаведныя пасады асоб "польскага паходжання" і яўрэяў, а таксама прадстаўнікоў немаёмасных класаў[9]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі пытанні асабовага складу міравых суддзяў разгледжаны А.Ф.Свіб, І.Г.Гушчынскім, А.А.Загорнавым, якія падкрэслівалі значную ўвагу з боку улад імперыі да падбору кадраў на дадзеныя пасады і сувязь гэтага з палітыкай па інтэграцыі краю ў склад імперыі[10]. Праблеме палітыкі самадзяржаўя ў дачыненні да мясцовага дваранства рымска-каталіцкага веравызнання прысвечаны артыкул А.П.Жытко і К.Ю.Тарановіч[11], у якім закранаецца праблема доступу асоб "польскага паходжання" да дзяржаўнай службы, у тым ліку і ў судах.

### Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі пасля ўвядзення судовай рэформы 1864 г.

Паводле судовай рэформы 1864 г., у аснове якой ляжалі зацверджаныя 20 лістапада 1864 г. Аляксандрам II Судовыя статуты, судовая сістэма складалася з дзвюх галін судовых устаноў — міравых і агульных. вярхоўнай касацыйнай інстанцыяй з'яўляўся Сенат.

Да міравых судовых установаў належалі міравыя суддзі (1-я інстанцыя) і з'езды міравых суддзяў (апеляцыйная інстанцыя). Ім былі падсудныя грамадзянскія іскі на суму да 500 руб., а таксама дробныя крымінальныя справы. Міравыя суддзі падзяляліся на ўчастковых і ганаровых. Першыя вялі прыём грамадзян і разглядалі справы ў межах сваіх участкаў. Ганаровыя міравыя суддзі сваіх участкаў не мелі і прыём грамадзян на рэгулярнай аснове не вялі. Яны маглі вырашаць судовыя справы толькі пры добраахвотным звароце да іх суцяжнікаў. Ганаровымі міравымі суддзямі звычайна былі асобы, якія мелі аўтарытэт сярод мясцовай грамадскасці. Часцей за ўсё — буй-

**Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі пасля ўвядзення судовай рэформы 1864 г.**




РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ




*Мінскі акруговы суд.* Фота канца XIX — пачатку XX ст.



*Віцебскі акруговы суд.* Фота пачатку XX ст.

ныя землеўласнікі, прадпрымальнікі, адстаўныя чыноўнікі і вайскоўцы. У адрозненне ад участковых, ганаровыя міравыя суддзі выкананнем функцыі правасуддзя займаліся на грамадскіх пачатках, г. зн. платы за сваю працу не атрымлівалі. Рашэнне міравога суддзі можна было абскардзіць у судзе другой інстанцыі — з'ездзе міравых суддзяў (міравым з'ездзе), які з'яўляўся калегіяльным судовым органам міравых суддзяў (як участковых, так і ганаровых) пэўнай тэрыторыі (звычайна павета).

Да галіны агульных судоў адносіліся акруговыя суды (ад аднаго да трох на губерню) як суд 1-й інстанцыі, а таксама судовыя палаты (адна на некалькі губерняў), якія былі 2-й (апеляцыйнай) інстанцыяй для падачы скарг на рашэнні акруговых судоў. Пры гэтым для вырашэння найбольш важных крымінальных спраў (напрыклад, аб дзяржаўных злачынствах) судовыя палаты былі судом 1-й інстанцыі.

У той жа час значная колькасць спраў заставалася па-за межамі юрысдыкцыі названых судовых органаў і разглядалася сялянскімі (валаснымі), вайсковымі, духоўнымі і некаторымі іншымі судамі, непадведамаснымі міністэрству юстыцыі.

Як ужо было сказана, урад адразу не пайшоў на распаўсюджанне судовай рэформы 1864 г. на заходнія губерні па палітычных матывах. Найперш з-за таго, што выбарныя пасады міравых суддзяў маглі заняць асобы "польскага паходжання". Аднак ужо ў канцы 1860-х гг., калі пагроза паўтарэння падзей 1863—1864 гг. паступова зменшылася, ва ўрадавых колах сфарміравалася цвёрдае перакананне аб неабходнасці распаўсюдзіць дзеянне Судовых статутаў на Заходні край. Пры гэтым мела месца выразнае разуменне таго, што належным чынам уладкаванае, хуткае і справядлівае правасуддзе будзе спрыяць умацаванню даверу мясцовага насельніцтва да расійскіх уладаў. Так, у паведамленні віленскага генерал-губернатара А.Л.Патапава ад 28 сакавіка 1869 г. на імя цара гаварылася: *"Судебная реформа должна привить публике чувство уважения к закону и веры в его прочность"*[12].

Пасля даволі працяглых абмеркаванняў, узгадненняў, правядзення адпаведных падрыхтоўчых мерапрыемстваў у 1872 г. былі ажыццёўлены першы этап рэалізацыі судовай рэформы ў заходніх губернях — пачалі дзейнічаць міравыя суддзі. Аднак у адрозненне ад унутрырасійскіх губерняў яны тут не выбіраліся, а прызначаліся міністрам юстыцыі. У 1883 г. у губернскіх гарадах былі адкрыты акруговыя суды, пачалі дзейнічаць інстытуты суда прысяжных і адвакатуры. Стварэнне судовых палат у беларускіх губернях не прадугледжвалася. Гродзенскі і Мінскі акруговыя суды былі падначаленыя Віленскай судовай палаце, Віцебскі — Санкт-Пецярбургскай, Магілёўскі — Кіеўскай[13].

## Асаблівасці фарміравання асабовага складу міравых суддзяў

Паводле Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г. пасады міравых суддзяў былі выбарныя (тэрмінам на 3 гады). Выбары ажыццяўляліся павятовымі земскімі сходамі і гарадскімі думамі. Для кандыдатаў закон прадугледжваў пэўныя крытэрыі: 1) пражыванне ў адпаведным павеце і ўзрост не менш за 25 гадоў; 2) наяўнасць вышэйшай ці сярэдняй адукацыі, альбо трохгадовага вопыту службы на такіх пасадах, на якіх яны маглі набыць практычныя навыкі ў вядзенні судовых спраў; 3) адпаведнасць маёмаснаму цэнзу: валоданне зямлёй у памеры ад 400 да 1600 дзесяцін (у залежнасці ад павета) ці іншай нерухомасцю коштам не менш 15 тыс. руб., альбо нерухомай маёмасцю ў гарадах, з якой выплочваўся падатак не менш за 3 тыс. руб. (у Санкт-Пецярбурзе і Маскве — не менш за 6 тыс.). Пры гэтым земскія сходы мелі права выбіраць у якасці міравых суддзяў і асоб, якія не адпавядалі згаданым патрабаванням, але *"приобрели общественное уважение и доверие своими заслугами и полезной деятельностью"*. Але рашэнне па такіх кандыдатурах павінна было быць аднагалосным. У той жа час па законе міравымі суддзямі не маглі быць: 1) асобы, якія знаходзіліся пад следствам або судом, падвяргаліся па рашэнні суда пакаранню не менш за турэмнае зняволенне, а таксама тыя, хто быў пад судом і не апраўданы судовым прысудам; 2) выключаныя са службы па судзе з духоўнага ведамства і дваранскіх сходаў; 3) абвешчаныя недзея-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Знак мiравога суддзi.*

здольнымі даўжнікамі; 4) асобы, якія знаходзіліся пад апекай за марнатраўства; 5) святары і царкоўныя служачыя[14].

Выбарны характар міравых суддзяў стаў адным з галоўных чыннікаў, які доўгі час перашкаджаў распаўсюдзіць судовую рэформу 1864 г. на тэрыторыю Заходняга краю. Гэта адбылося толькі ў 1872 г. — у адпаведнасці з указам ад 23 чэрвеня 1871 г.[15]. У ім прадугледжваўся шэраг выключэнняў з Судовых статутаў. Галоўнае з іх — замена ў 9 заходніх губернях выбарнасці міравых суддзяў прызначэннем іх міністрам юстыцыі.

Увядзенне выбарнасці міравых суддзяў на тэрыторыі Беларусі ўскладнялася адсутнасцю тут земстваў, бо, паводле Судовых статутаў, выбары павінны былі адбывацца менавіта на земскіх павятовых сходах. Тым не менш ва ўрадавых колах дадзенае пытанне абмяркоўвалася. Міністр юстыцыі К.І.Пален яшчэ ў чэрвені 1871 г. звяртаўся да міністра ўнутраных спраў А.Я.Цімашава з прапановай прапрацаваць магчымасць выбарнасці міравых суддзяў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а таксама ў Паўднёва-Заходнім краі (г.зн. Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губернях)[16]. Аднак гэтую ідэю не падтрымалі ні міністр унутраных спраў, ні мясцовыя губернатары, ні сам імператар[17]. Аляксандр II пры праглядзе тэксту з меркаваннем кіеўскага генерал-губернатара А.М.Дандукова-Корсакава ад 26 кастрычніка 1872 г. на словах аб тым, што выбарныя міравыя суддзі *"весьма часто составляют не поддержку правительству, а предмет новых затруднений и придирчивых пререканий с администрацией"*, зрабіў запіс: *"Совершенно справедливо, как мы видим из грустных опытов"*[18]. Да 1917 г. ідэя выбарнасці міравых суддзяў у беларускіх губернях так і не была рэалізаваная. Асноўным матывам немэтазгоднасці выбарнасці міравога суда ў краі выступаў палітычны фактар. Улічваючы прадугледжаны заканадаўствам адукацыйны і маёмасны цэнз, значная частка пасад міравых суддзяў магла быць занятая мясцовымі дваранамі рымска-каталіцкага веравызнання. Давяраць жа функцыі правасуддзя дадзенай катэгорыі насельніцтва, якая мела статус палітычна нядобранадзейнай, улады лічылі немагчымым.

Пры гэтым варта адзначыць, што ва ўжо згаданым указе аб увядзенні міравых суддзяў у 9 заходніх губернях, падпісаным імператарам 23 чэрвеня 1871 г., аб забароне займаць гэтыя пасады асобам "польскага паходжання" нічога не гаварылася. Хаця ў заключэнні Дзяржаўнага савета па дадзеным пытанні быў пункт: *"Находя существенно необходимым, чтобы должности мировых судей в западных губерниях были замещаемы исключительно лицами вполне благонадёжными в политическом отношении... мировыми судьями могут быть только лица не польского происхождения"*[19]. Але па сутнасці заканадаўча замацоўваць такую норму не было патрэбы. Папершае, дзейнічала згаданая вышэй пастанова Заходняга камітэта 1864 г. аб замяшчэнні ўсіх "блізкіх да народу" пасад у Заходнім краі асобамі "рускага паходжання"[20]. Па-другое, міравых суддзяў прызначаў асабіста міністр юстыцыі, а значыць, было дастаткова адпаведнай негалоснай устаноўкі. Увогуле ў канцы 1860-х — першай палове 1870-х гг., калі на пасадзе віленскага генерал-губернатара знаходзіўся А.Л.Патапаў, назіралася змякчэнне палітыкі самадзяржаўя ў адносінах да мясцовага дваранства. Таму магчыма, што адсутнасць у канчатковым тэксце указа пункта аб забароне асобам "польскага паходжання" займаць пасады міравых суддзяў у заходніх губернях была выкліканая нежаданнем улады без лішняй патрэбы правакаваць раздражненне ў асяроддзі вышэйшага саслоўя краю. Крыху пазней у адпаведнасці з "Высочайшим повелением" Аляксандра II ад 2 жніўня 1873 г.[21] было дазволена прызначэнне асоб "польскага паходжання" на пасады ганаровых міравых суддзяў. Па некаторых звестках ініцыятарам гэтай ідэі быў тагачасны віленскі генерал-губернатар А.Патапаў[22].

Акрамя замены выбарнасці міравых суддзяў іх прызначэннем указ ад 23 чэрвеня 1871 г. утрымліваў яшчэ адно важнае адрозненне ад тэксту Судовых статутаў. У заходніх губернях для міравых суддзяў быў значна зніжаны маёмасны цэнз — да 100 дзесяцін зямлі (у большасці унутрырасійскіх губерняў ён складаў ад 400 да 700 дзесяцін). Гэта было зроблена з мэтай вырашыць праблему недахопу тут асоб "рускага паходжання", якія б адпавядалі гэтаму цэнзу. Па словах віленскага губернатара Я.П.Сцеблін-Каменскага, выказаных у 1869 г. у перапісцы з міністэрствам юстыцыі, большасць "рускіх" землеўладальнікаў краю былі дзеючымі ці былымі чыноўнікамі, якія мелі *"фермы столь незначительные"*, што не адпавядалі цэнзу, прадугледжанаму Судовымі статутамі для міравых суддзяў[23]. З мэтай зацікавіць мясцовых "рускіх" памешчыкаў займаць дадзеныя пасады, а таксама прыцягнуць для гэтага сюды землеўласнікаў з унутрырасійскіх губерняў, у 1874 г. у 9 заходніх губернях былі значна павялічаны аклады ўчастковых міравых суддзяў: з 2000 да 2700 руб.[24]. Акрамя таго, для асоб "рускага паходжання" рабіліся выключэнні ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

плане выканання імі маёмаснага цэнзу. Напрыклад, пракурорам Мінскага акруговага суда 12 кастрычніка 1892 г. было загадана таварышу пракурора па Барысаўскім павеце А.А.Скульскаму падаць звесткі, хто б з мясцовых жыхароў праваслаўнага веравызнання мог быць прызначаны на пасады ганаровых міравых суддзяў, хаця і не адпавядаў усім патрабаванням закона, у першую чаргу маёмаснаму цэнзу[25].

Трэба адзначыць, што імкненне ўрада фарміраваць склад міравых суддзяў заходніх губерняў з асоб "рускага паходжання" значна звужала выбар кандыдатаў на дадзеныя пасады. У выніку гэтага адукацыйны ўзровень міравых суддзяў тут быў ніжэйшы, чым у цэлым па імперыі. Па звестках за 1889 г., сярод прызначаных урадам міравых суддзяў вышэйшую адукацыю мелі: у Магілёўскай губерні — 69%, Віленскай — 68%, Мінскай — 55%, Віцебскай — 54%, Гродзенскай — 50%, Ковенскай — 47%. У той жа час у сярэднім па імперыі гэты паказчык складаў 72%[26].

Дзеянні ўрада, накіраваныя на кантроль за фарміраваннем асабовага складу міравых суддзяў у Заходнім краі, відавочна, супярэчылі задумцы аўтараў Судовых статутаў, па якой выбарнасць інстытута міравога суда павінна была забяспечыць яго самастойнасць. Пры гэтым адзначым, што ў сваёй дзейнасці міравыя суддзі заходніх губерняў, прызначаныя міністрам юстыцыі, заставаліся ў дастатковай ступені незалежнымі ад мясцовай губернскай адміністрацыі. Аб гэтым сведчаць скаргі губернатараў краю на іх дзейнасць. Так, у 1873 г. магілёўскі губернатар А.С.Дэмбавецкі паведамляў у міністэрства юстыцыі, што міравы суддзя Лаўрычэнка *"проявляет особое пристрастие"* ў справах з удзелам яўрэяў і выносіць прысуды на іх карысць[27]. У справаздачах магілёўскага і віцебскага губернатараў (адпаведна А.С.Дэмбавецкага і В.М.Даўгарукава) за 188[illegible] г. гаварылася аб марудным вырашэнні спраў міравымі суддзямі, прычым асаблівая ўвага звярталася на залішнюю паблажлівасць да сялян у іх зямельных спрэчках з памешчыкамі[28]. У 1890-я гг. мінскі, магілёўскі і віцебскі губернатары не раз выказваліся ў сваіх справаздачах і перапісцы з міністэрствам унутраных спраў аб мэтазгоднасці ўвядзення ў іх губернях Палажэння аб земскіх участковых начальніках ад 12 ліпеня 1889 г. — г. зн. за замену ў сельскай мясцовасці міравых судоў падпарадкаванымі ім чыноўнікамі, якія сумяшчалі б адміністрацыйныя і судовыя функцыі[29]. Па наяўных крыніцах цяжка ацаніць маштаб супярэчнасцяў паміж міравымі суддзямі і адміністрацыйнымі ўладамі. Аднак яны даюць падставу не пагадзіцца з тэзісам савецкай гістарыяграфіі аб тым, што ў заходніх губернях міравыя суддзі з незалежных ад адміністрацыі асоб ператварыліся ў прыдатак улады[30].

## Фарміраванне кадравага складу акруговых судоў

У 1883 г. адбыўся другі этап увядзення судовай рэформы 1864 г. у беларускіх губернях. У губернскіх гарадах замест былых злучаных палат крымінальнага і грамадзянскага суда былі адкрыты акруговыя суды. Паводле Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г., іх старшыні, а таксама суддзі, пракуроры і судовыя следчыя прызначаліся імператарам па прапанове міністра юстыцыі[31]. У такіх абставінах прапісваць у заканадаўстве нейкія абмежаванні ў адносінах да кандыдатаў на дадзеныя пасады па нацыянальнай ці канфесійнай прыкмеце было проста непатрэбна.

Пры фарміраванні кадравага складу зноў адкрытых устаноў урад сутыкнуўся з недахопам у краі кандыдатур, якія б адпавядалі прадугледжаным заканадаўствам патрабаванням (вышэйшая адукацыя, вопыт працы ў судовым ведамстве і некаторыя інш.) і ўваходзілі ў катэгорыю добранадзейных. У сувязі з гэтым у 1883—1884 гг. у паўночна-заходнія губерні прыбыла значная колькасць судовых чыноўнікаў з іншых мясцовасцяў імперыі. Па Мінскаму акруговаму суду іх лічба за адзначаныя два гады склала 35 чалавек, у той час як за два папярэднія гады (1881—1882) іх прыбыло сюды толькі 11[32].

У цэлым намаганні ўрада прывялі да таго, што судзейскі корпус як міравых, так і акруговых судоў на тэрыторыі Беларусі складаўся ў апошняй трэці XIX — пачатку XX ст. практычна поўнасцю з асоб праваслаўнага веравызнання (у асноўным землеўласнікаў). Аднак ўрада імкнулася не дапусціць непажаданых для сабе асоб і на пасады ніжэйшага ўзроўню: кандыдатаў на судовыя пасады, канцылярскіх служачых (сакратараў, пісьмаводаў), прыставаў і нават рассыльных. Гэта было абумоўлена тым, што яны мелі непасрэдны кантакт з насельніцтвам і маглі аказваць на яго уплыў.

Судовыя статуты прадугледжвалі ўвядзенне пры судовых палатах і акруговых судах штатных адзінак кандыдатаў на пасады па судовым ведамстве (кандыдатаў на судовыя пасады)[33]. Гэта рабілася для таго, каб асобы, якія атрымалі юрыдычную адукацыю, маглі здабыць неабходны прафесійны досвед і мець дастатковы стаж для далейшай працы ў судзейскім корпусе, следстве, пракуратуры альбо адвакатуры. Іх абавязкі былі надзвычай разнастайнымі (яны выконвалі функцыі следчага, адваката, сакратара і г. д.). Паводле Судовых статутаў, прызначаць на дадзеныя пасады сваімі рашэннямі маглі як міністр юстыцыі, так і старшыні канкрэтных судовых палат і акруговых судоў. У сітуацыі кадравага недахопу ў судовыя ўстановы беларускіх губерняў у дадзенай якасці прымаліся ў тым ліку і асобы каталіцкага веравызнання[34]. Гэта выклікала занепакоенасць ва ўрадзе. Напрыклад, у прадпісанні міністра юстыцыі М.А.Манасеіна ад 21 чэрвеня 1890 г. з паметкай "цалкам канфідэнцыяльна" на імя старшыні Мінскага акруговага суда А.П.Клачэнка гаварылася, што кандыдатам на судовыя пасады "польскага паходжання" ні ў якім разе нельга давяраць абавязкі судовых следчых і таварышаў пракурора (гэта магло быць у адпаведнасці з арт. 415 "Учреждения судебных установлений"). Згодна з сакрэтным цыркулярам Міністэрства юстыцыі ад 9 студзеня 1892 г. прыняцце асоб "польскага паходжання" ў якасці кандыдатаў на судовыя паса-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ды пры акруговых судах заходніх губерняў было наогул забаронена[35].

Паводле Судовых статутаў, канцылярскія служачыя судовых палат і акруговых судоў прызначаліся іх старшынямі, міравыя суддзі самі наймалі сваіх пісьмаводаў[36]. У сувязі з тым, што кола пісьменных асоб праваслаўнага веравызнання, якія б маглі і жадалі выконваць дадзеныя абавязкі, было ў краі адносна невялікім, у якасці канцылярскіх служачых у судовыя органы прыцягваліся і асобы "польскага паходжання", нягледзячы на згаданыя вышэй інструкцыі Заходняга камітэта 1864 г.

Віленскі генерал-губернатар І.С.Каханаў, прызначаны на пасаду ў верасні 1884 г., распачаў дзейнасць па поўным ачышчэнні дзяржаўных устаноў (у тым ліку судовых органаў) ад асоб каталіцкага веравызнання. У сваёй запісцы "О составе служащих в Северо-Западном крае" ад 9 кастрычніка 1884 г. у Камітэт міністраў ён адзначаў, што, нягледзячы на згаданыя вышэй правілы Заходняга камітэта ад 27 мая 1864 г., тут на службе знаходзілася вялікая колькасць каталікоў. Прычым падкрэслівалася, што гэта *"всецело относится к большинству низших должностей и, главное, к составу канцелярских чиновников и служителей, и вольнонаёмных писцов"*[37]. Дадзеныя пасады, на думку І.С.Каханава, *"были очень важны, так как имели непосредственное соприкосновение с народом"*[38]. У сувязі з гэтым ён выступаў катэгарычна супраць знаходжання на іх каталікоў: *"Я сомневаюсь, что даже крайне редкие добросовестные чиновники из католиков, находясь под контролем окружающей их и родственной им польской среды, могли идти в разрез с польскими стремлениями"*. Генерал-губернатар настойваў на неабходнасці замены іх "рускімі" чыноўнікамі, для прыцягнення якіх у край з унутраных губерняў ён прапаноўваў падвысіць адпаведныя льготы (кампенсацыя выдаткаў на пераезд, надбаўкі і г. д.)[39]. Аднак на справе каталікі працягвалі працаваць у судовых органах у якасці канцылярскіх служачых. Натуральна, калі адносна высокія аклады для суддзяў у комплексе з пэўнымі льготамі маглі прывабіць чыноўнікаў з унутраных губерняў, то на пасады дапаможнага персаналу прыцягнуць іх было значна больш складана.

У адпаведнасці з сакрэтным цыркулярам міністэрства юстыцыі ад 21 ліпеня 1885 г. асобам "польскага паходжання" было забаронена займаць у 9 заходніх губернях пасады сакратароў у судовых установах, судовых прыставаў, натарыусаў[40]. Вышэйстаячыя судовыя органы пільна сачылі за канфесійным складам судовых кадраў і час ад часу патрабавалі ад акруговых судоў адпаведных звестак. Напрыклад, старшыня Віленскай судовай палаты А.А.Стадольскі ў перапісцы са старшынёй Мінскага акруговага суда А.П.Клачэнка 6 ліпеня 1892 г. прасіў апошняга паведаміць, ці займаюць якія-небудзь пасады ў Мінскім акруговым судзе асобы рымска-каталіцкага веравызнання. Такіх аказалася ўсяго толькі некалькі канцылярскіх служачых[41].

Яшчэ адным захадам урада, накіраваным на абмежаванне доступу каталікоў да пасад у судовых органах у Заходнім краі, стаў сакрэтны цыркуляр міністэрства юстыцыі ад 10 чэрвеня 1893 г. У ім адзначалася, што згаданыя вышэй цыркулярныя прадпісанні міністэрства юстыцыі ад 21 ліпеня 1885 г. на практыцы не заўсёды выконваліся і мелі месца выпадкі прызначэння асоб "польскага паходжання" на пасады сакратароў, судовых прыставаў і натарыусаў. Адпаведна старшыням судовых устаноў было загадана больш пільна сачыць за тым, каб гэтага не адбывалася. Акрамя таго, паводле сакрэтнага цыркуляра Міністэрства юстыцыі ад 10 чэрвеня 1893 г. асобам "польскага паходжання" забаранялася займаць пасады памочнікаў сакратароў і рассыльных у судовых установах заходніх губерняў[42].

12 снежня 1904 г. расійскім імператарам Мікалаем II быў падпісаны ўказ "О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка"[43]. Сярод іншага ён прадугледжваў перагляд дзеючых абмежаванняў праваў *"инородцев и уроженцев отдельных местностей империи"*. У кантэксце правоў асоб "польскага паходжання" на службу ў судовых установах Заходняга краю канкрэтныя меры па рэалізацыі гэтага пункта знайшлі ўвасабленне ў журнале Камітэта міністраў, зацверджаным Мікалаем II 1 мая 1905 г. У ім быў вызначаны канкрэтны пералік пасад па ведамстве міністэрства юстыцыі, якія не маглі займаць асобы "польскага паходжання": "старшего председателя" і старшынь дэпартаментаў судовай палаты, старшынь акруговых судоў, а таксама чыноў пракуратуры[44]. Гэтыя абмежаванні датычыліся толькі Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў. Такім чынам, усе астатнія пасады ў судовых установах беларускіх губерняў каталікі фармальна маглі займаць без абмежаванняў, а ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях — нават быць старшынямі акруговых судоў, пракурорамі ці таварышамі пракурора. Пры гэтым у дакуменце адзначалася, што прыведзены пералік не азначае неабходнасці прызначаць асоб "польскага паходжання" на пасады, якія ў яго не ўвайшлі[45]. Дадзеныя прадпісанні насілі характар канфідэнцыяльных і ў тэкст імператарскага ўказа ад 1 мая 1905 г. аб адмене некаторых абмежавальных пастаноў у 9 заходніх губернях[46] уключаныя не былі. Справа ў тым, што абмежаванні для асоб "польскага паходжання" займаць пасады ў дзяржаўных установах у свой час уводзіліся не ў афіцыйным заканадаўчым парадку, а праз пастановы Заходняга камітэта, "высочайшие повеления" ці сакрэтныя цыркуляры міністэрства юстыцыі, якія не абнародаваліся. А значыць, і адмяняць іх у заканадаўчым парадку, на думку ўлад, было немэтазгодна[47].

## Прыцягненне яўрэяў да канцылярскай працы ў судовых установах

Судовыя статуты ад 20 лістапада 1864 г. не прадугледжвалі абмежаванняў па нацыянальнай ці рэлігійнай прыкмеце пры фарміраванні кадравага складу судовых устаноў. Аднак яўрэяў, паводле

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Сакрэтны цыркуляр міністэрства юстыцыі ад 21 ліпеня 1885 г.*

**Старшимъ Предсѣдателямъ С.-Петербургской, Виленской, Кіевской и Одесской судебныхъ палатъ и Предсѣдателямъ окружныхъ судовъ въ губерніяхъ: Кіевской, Подольской, Волынской, Виленской, Ковенской, Гродненской, Витебской, Могилевской и Минской.**

*Іюля 21 дня 1885 года. № 11450.*

**13.**

Высочайше утвержденными 26 Марта и 22 Мая 1864 года положеніями бывшаго Западнаго Комитета установлено: должности начальниковъ отдѣльныхъ частей, равно какъ и должности, находящіяся въ непосредственномъ соприкосновеніи съ мѣстнымъ населеніемъ въ 9-ти губерніяхъ Западнаго края, не замѣщать лицами польскаго происхожденія.

Принимая во вниманіе, что къ числу должностей, на которыя должны быть распространяемы правила, изложенныя въ приведенныхъ Высочайшихъ повелѣніяхъ, безъ сомнѣнія относятся должности Секретарей и Судебныхъ Приставовъ, а также Нотаріусовъ, я считаю нужнымъ покорнѣйше просить Ваше Превосходительство озаботиться о томъ, чтобы открывающіяся вакансіи на тѣ изъ упомянутыхъ должностей, назначеніе на которыя по закону предоставлено Вашему Превосходительству, не были замѣщаемы лицами польскаго происхожденія.

Подписалъ: Министръ Юстиціи, Статсъ-Секретарь *Д. Набоковъ*.

"Устава о службе по определению от правительства", забаранялася прымаць на дзяржаўную грамадзянскую службу (за выключэннем некаторых выпадкаў: пры наяўнасці навуковай ступені, на пасады па медыцынскай і тэхнічнай частцы, а таксама ў губернскім межавым ведамстве)[48]. На практыцы гэта азначала, што ў сферы правасуддзя яны мелі права працаваць практычна толькі ў якасці адвакатаў.

Трэба адзначыць, што ў адпаведнасці з заканадаўствам яўрэі не маглі займаць у судовых установах нават пасады ніжэйшага парадку, у тым ліку пісьмаводаў і іншых канцылярскіх служачых. Аднак па найме, г. зн. без уключэння ў штат, яны прыцягваліся міравымі суддзямі, натарыусамі, а таксама нават судовымі следчымі і пракурорскімі чынамі да канцылярскай працы (вядзення пратаколаў, афармлення рознага роду папер і г. д.) за пэўную плату. Гэта даволі працяглы час не выклікала негатыўнай рэакцыі з боку міністэрства юстыцыі ці кіраўніцтва судовых палат і акруговых судоў. Але ў 1886 г., калі ў краіне ўвогуле назіралася ўзмацненне антыяўрэйскай палітыкі[49], урадам былі прынятыя меры па выкараненні практыкі найму судовымі органамі яўрэяў для выканання розных абавязкаў канцылярскага характару. У сакрэтным цыркуляры Міністэрства юстыцыі ад 30 красавіка 1886 г. гаварылася: *"в свете постоянно поступающих сведений о разнообразных неблагопристойных действиях евреев, которые допускаются к исполнению канцелярских обязанностей в учреждениях судебного ведомства"*, трэба неадкладна адхіліць іх ад усіх ад пасад у канцылярыях судовых следчых і чыноў пракурорскага нагляду[50]. У чэрвені 1886 г. міністэрствам юстыцыі быў выдадзены яшчэ адзін сакрэтны цыркуляр, у адпаведнасці з якім усе яўрэі ў двухмесячны тэрмін павінныя былі быць звольнены з канцылярскіх пасад пры міравых судовых установах у 9 заходніх губернях і ў будучым прыцягвацца да гэтых заняткаў не маглі[51].

Кіраўніцтва судовых устаноў краю ў далейшым уважліва адсочвала выпадкі прыцягнення яўрэяў да працы пры судах. Так, у лютым 1902 г. у Мінскі акруговы суд нейкі Абрам Шусцік паведаміў, што пры судовым прыставе Ігуменскага павета П.І.Карэліне абавязкі пісара выконвае яўрэй[52]. У сваім лісце ён пісаў: *"Кажется, не место еврею у судебного пристава, куда часто попадают такие дела, из которых этот еврейчик может извлечь себе выгоду, а взыскателю убытки"*[53]. Старшыня Мінскага акруговага суда П.Ф.Купчынскі вымусіў П.І.Карэліна даваць тлумачэнні. Той адказаў, што амаль месяц не меў пісара, і быў проста вымушаны звярнуцца да паслуг Мендэля Ніскевіча, і што гэты выпадак прыцягнення да працы яўрэя адзіны за 5 гадоў яго службы[54]. На гэтыя апраўданні старшыня Мінскага акруговага суда адказаў: *"Ни постоянно, ни временно, ни за плату сдельно по листам, ни за определённое жалование, судебные приставы не имеют права держать письмоводителей евреев... Если Вами будет допущено к занятиям в качестве письмоводителя лицо иудейского исповедания, то вы будете подвергнуты строгому взысканию"*[55]. У гэтым жа, 1902 г. кіраўніцтвам Мінскага акруговага суда за прыцягненне яўрэяў да канцылярскай працы былі зроблены заўвагі пінскаму натарыусу І.П.Падольскаму, а таксама пінскім судовым прыставам Руткоўскаму і Лукашэвічу[56].

Улады Расійскай Імперыі надавалі значную ўвагу фарміраванню асабовага складу судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі. Кадравая палітыка была цесна звязаная з мерамі па ўніфікацыі краю з унутранымі губернямі імперыі і накіраваная, з аднаго боку, на



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

недапушчэнне на пасады ў судовай сістэме катэгорый асоб, якія лічыліся палітычна нядобранадзейнымі (галоўным чынам каталікоў і яўрэяў), а з іншага — замяшчэнне іх асобамі "рускага паходжання", у тым ліку з унутрырасійскіх губерняў. Гэта знаходзіла рэалізацыю не толькі праз выданне афіцыйных заканадаўчых актаў, але таксама сакрэтных інструкцый і цыркуляраў. Палітычная дэтэрмінаванасць кадравай палітыкі ўрада вяла да штучнага адсячэння фактычна па нацыянальна-рэлігійнай прыкмеце доступу да працы ў судовай сістэме (нават на пасадах ніжэйшага звяна) цэлых пластоў мясцовага насельніцтва. Безумоўна, ва ўмовах вузкасці ў краі кола асоб "рускага паходжання" з адпаведнай адукацыяй ці нават проста дастатковым узроўнем пісьменнасці, гэта не магло не адбівацца негатыўным чынам на якасці функцыянавання сістэмы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі.

---

[1] Судебно-статистические сведения и соображения о введении в действие Судебных Уставов 20-го ноября 1864 года (по 32 губерниям). Ч. 1. СПб., 1866. С. 40.

[2] Свод законов Российской империи. Все 16 томов со всеми относящимися к ним продолжениями в одной книге. Т. III. Кн. 1. СПб., 1900. С. 2.

[3] Полное собрание законов Российской империи (далей — ПСЗРИ). Собр. 2. Т. 39. 1864. Отд. 2. СПб., 1867. № 41475—41478.

[4] Там жа. Т. 38. 1863. Отд. 2. СПб., 1866. № 40208.

[5] Там жа. Т. 39. 1864. Отд. 1. СПб., 1867. № 41236.

[6] Там жа. Т. 42. 1867. Отд. 2. СПб., 1871. Доп. к т. 40. № 42328 а.

[7] Российский государственный исторический архив (далей — РГИА). Ф. 1405, оп. 85, д. 2992, л. 3.

[8] Журналы Комитета министров по исполнению указа 12 декабря 1904 г. [СПб.], 1905. С. 348.

[9] Марыскин А.В. Судебная реформа 1864 года и особенности ее проведения на территории Белоруссии: автореф. ... дис. канд. юрид. наук: 12.00.01. М., 1985. С. 21; Белевич Ф.Р. Проведение судебной реформы 1864 года в Белоруссии // Вопросы общенародного государства и права Белорусской ССР. Мн., 1963. С. 53; Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во 2-й половине XIX века. Мн., 1980. С. 87.

[10] Свіб А.Ф. Асаблівасці правядзення расійскай судовай рэформы 1864 г. на Гродзеншчыне // Вес. Акад. навук Беларусі. Сер. гум. навук. 1993. № 4. С. 27—30; Гушчынскі І.Г. Абмеркаванне шляхоў па ўвядзенні міравых судоў на тэрыторыі Беларусі (1868—1872 гг.) // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. 2014. № 2. С. 26—28; Загорнов А.А. Учреждение мировой юстиции на территории Беларуси // Исторический поиск Беларуси: альманах. Мн., 2006. С. 78—90.

[11] Жытко А.П., Тарановіч К.Ю. Палітыка самадзяржаўя ў дачыненні да "асобаў польскага паходжання" на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2015. № 3. С. 5—11.

[12] РГИА. Ф. 1405, оп. 534, д. 851, л. 2.

[13] ПСЗРИ. Собр. 3. Т. 3. 1883. СПб., 1886. № 1823, 1842.

[14] ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 39. 1864. Отд. 2. № 41475.

[15] Там жа. Т. 46. 1871. Отд. 1. № 49750.

[16] РГИА. Ф. 1405, оп. 69, д. 6114, ч. Іа, л. 1 об. – 2.

[17] Там жа. Л. 39-40, 45.

[18] Там жа. Л. 45.

[19] Отчет по делопроизводству Государственного Совета за 1871 год. СПб., 1873. С. 7.

[20] РГИА. Ф. 1405, оп. 85, д. 2992, л. 3.

[21] Там жа. Оп. 534, д. 1062, л. 1.

[22] П. П. О почетных мировых судьях в Северо-Западном крае (по поводу предполагаемого введения таковых в Царстве Польском) // Русь. 1883. № 8. С. 62.

[23] РГИА. Ф. 1405, оп. 64, д. 7643, л. 242.

[24] ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 49. 1874. СПб., 1876. № 53420.

[25] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 197, воп. 1, спр 7, арк. 1 – 1адв.

[26] Окунев Н. К вопросу об образовательном цензе и продолжительности службы мировых судей // Журн. М-ва юстиции. 1896. № 2. С. 209.

[27] РГИА. Ф. 1405, оп. 534, д. 1061, л. 1.

[28] Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам за 1881—1890 гг. [СПб.?], 1903. С. 387, 394.

[29] Отчет по делопроизводству Государственного совета за сессию 1891—1900 гг. Т. 2. СПб., 1900. С. 366-367; Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам за 1893 г. [СПб.?], 1895. С. 23, 159.

[30] Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во 2-й половине XIX века. С. 85.

[31] Судебные уставы 20 ноября 1864 г. с разъяснением их по решениям кассационных департаментов Правительствующего Сената 1866, 1867, 1868 и 1869 гг. СПб., 1870. С. 31—32.

[32] НГАБ. Ф. 183, воп. 1, спр. 34, арк. 193.

[33] Судебные уставы 20 ноября 1864 г. с разъяснением их по решениям кассационных департаментов Правительствующего Сената 1866, 1867, 1868 и 1869 гг. С. 60.

[34] НГАБ. Ф. 183, воп. 1, спр. 125, арк. 7.

[35] Там жа. Спр. 165, арк. 112.

[36] Судебные уставы 20 ноября 1864 г. с разъяснением их по решениям кассационных департаментов Правительствующего Сената 1866, 1867, 1868 и 1869 гг. С. 10, 32.

[37] РГИА. Ф. 1405, оп. 85, д. 2992, л. 3.

[38] Там жа. Л. 4.

[39] Там жа.

[40] Сборник циркуляров Министерства юстиции (с 1877 г. по 1914 г.). Секретные. Петроград, 1914. С. 63.

[41] НГАБ. Ф. 183, воп. 1, спр. 37, арк. 83-84.

[42] Там жа. Спр. 165, арк. 20.

[43] ПСЗРИ. Собр. 3. Т. 24. 1904. Отд. 1. СПб., 1907. № 25495.

[44] Журналы Комитета министров по исполнению указа 12 декабря 1904 г. [СПб.], 1905. С. 377.

[45] Там жа. С. 352.

[46] ПСЗРИ. Собр. 3. Т. 25. Отд. 1. 1905. СПб., 1908. № 26162.

[47] Журналы Комитета министров по исполнению указа 12 декабря 1904 г. [СПб.], 1905. С. 349.

[48] Сборник законов о евреях с разъяснениями по определениям Правительствующего сената и циркулярам министерств / Сост. Ю.В.Гессен, В.Фридштейн. СПб., 1904. С. 213-214.

[49] Гессен Ю.И. История еврейского народа в России. Т. 2. Л., 1927. С. 228.

[50] НГАБ. Ф. 197, воп. 1, спр. 7, арк. 2.

[51] Там жа. Арк. 20.

[52] НГАБ. Ф. 183, воп. 1, спр. 305, арк. 22.

[53] Там жа.

[54] Там жа. Арк. 20.

[55] Там жа. Арк. 21.

[56] Там жа. Арк. 23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ